# Глава 1

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ЎСХОДНЕПАЛЕСКАЙ «СТРЭЛЬНАЙ» АБРАДНАСЦІ Ў НАВУКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Прынятая ў навуцы назва ўнікальнай з'явы веснавой абраднасці Усходняга Палесся – *ваджэнне/пахаванне «стралы»* [4, с. 231]. Менавіта пад такой назвай абрад, зафіксаваны ў в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобл., у 2007 г. быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (катэгорыя Б) (Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98–З «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», арт. 16. п. 4.2.: катэгорыя «Б» – гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія поўнасцю або часткова аднаўлены (зафіксаваны) на другасным матэрыяле ці адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці якіх аб'ектыўна з часам могуць змяняцца).

Гістарыяграфія гэтай з'явы ў славянскай фалькларыстыцы пачынаецца з адзінкавых публікацый асноўнай «стрэльнай» песні ў першай палове XIX ст. Першыя ўзоры песень запісаны ў 1814–1819 гг. заснавальнікам славяназнаўства З. Даленгам-Хадакоўскім. З іх усяго два тэксты, зафіксаваныя славутым збіральнікам на Падоллі і Валыні, дайшлі да нас у спісе А. Бадзянскага.

У працы З. Радчанка «Гомельскія народныя песні (беларускія і маларускія)» (1888) змешчаны вельмі цікавы тэкст гэтай абрадавай песні з сямейна-бытавым матывам у фінале – «жонка плача па мужу да абеду, а па абедзе выходзіць у танок і выбірае новага мужа» [51, с. 39–40]. Этнаграфічны кантэкст абраду апісаны ўкладальніцай схематычна, час выканання, як пазначана, абмяжоўваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

велікодным тыднем. Пазнейшая публікацыя З. Радчанка ў «Зборніку маларускіх і беларускіх песень Магілёўскай губерні» (1911) мае нотны дадатак, які з'яўляецца адным з самых ранніх нотных запісаў.

У працы А. Дабравольскага «Смаленскі этнаграфічны зборнік» (1903) надрукаваны тры тэксты «стрэльнай» песні. Аўтар не ўказвае на іх абрадавую прымеркаванасць і дае жанравае азначэнне як «плач маці, сястры і жонкі па молайцу» [17, с. 122–123]. Гэтыя ўзоры – каштоўны матэрыял для даследавання эвалюцыі абрадавай песні, якая адбывалася, паводле Л. Салавей, у кірунку ад архаічнага абрадавага сюжэта да ліра-эпічнага, баладнага [54, с. 91]. Пацвярджэннем гэтаму служаць далучаны да асноўнага сюжэта баладны матыў «тры ластаўкі ля забітага малойчыка» і народна-хрысціянскія вобразы ў фінале: *Панясслі цела ў царковачку: // Самі дзверычкі расчыніліся, // Самі званы зазваніліся, // Самі свечы зацяпліліся, // Цела белае схаранілася* [17, с. 123].

У 1912 г. Е. Раманаў у 8-м выпуску «Беларускага зборніка» прыводзіць фрагментарныя звесткі пра абрад, зафіксаваны ў с. Юркавічы Гомельскага павета. Кароткі тэкст галоўнай песні і тэкст з матывам любоўных заляцанняў, які пачынаецца словамі *Сула, Сула рака паляцела даляка*, суправаджаюцца тлумачэннем укладальніка: песні выконваюцца дзяўчатамі «ідучы ўздоўж вуліцы, узяўшыся за рукі» [52, с. 178].

У 1920-я гг. у Інстытуце беларускай культуры адбываецца актыўная краязнаўчая і фальклорна-этнаграфічная праца, актывізуецца збіранне многіх з'яў народнай абрадавай культуры. У 1926 г. у штомесячніку «Наш край» пры Інбелкульце з'яўляецца кароткі нарыс карэспандэнта М. Каршукова пад назвай «Пахаванне стралы», у якім абрад, зафіксаваны ў в. Стаўбун Веткаўскага раёна, называецца «заключным актам усяго веснавога цыклу звычаяў і песень» [28, с. 41]. М. Каршукоў здолеў зафіксаваць больш поўны, чым у Е. Раманава, варыянт: *А ідзі, страла, ды ўздоўж сяла, // Охі-ой, люлі, ды ўздоўж сяла* з выразна развітым заключным матывам «плач па забітым малойчыку». Карэспандэнт часопіса «Наш край» указаў на дзявочыя карагоды і закопванне ў полі абрадавых атрыбутаў. Публікацыя М. Каршукова заканчвае першы этап гістарыяграфіі абраду, для якога характэрны апісальны падыход.

Другі этап – канцэптуальны – пачынаецца з 1970-х гг.; для яго характэрна даследаванне міфасемантыкі і структуры абраду, жанравай эвалюцыі і этнафоніі абрадавых песень. Л. Салавей у манаграфіі «Беларуская народная балада» (1978) аналізуе, як ужо адзначалася, эвалюцыю «стрэльнай» песні. Абрадавая/заклінальная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

песня з матывам стралы, як лічыць аўтар, мае найперш засцерагальную семантыку. Наяўнасць у некаторых варыянтах імператыва «забіць добра молайца» з'яўляецца, на думку Л. Салавей, дэфектам, абумоўленым паступовай стратай або скажэннем абрадавай функцыі песеннага твора. Пазней «цэнтральнае месца ў ёй заняла старажытная, гранічна адшліфаваная формула параўнання пачуццяў блізкіх, якая вельмі адпавядала родавай ідэалогіі, ідэалогіі матрыярхату, а потым атрымала вузейшае, толькі сямейнае гучанне» [54, с. 94]. Потым да сюжэта далучыліся народна-хрысціянскія матывы, ствараючы чужароднае ўключэнне ў дахрысціянскую тканіну твора. Вельмі цікавым з'яўляецца тэзіс Л. Салавей аб тым, што архаічны сюжэт «стрэльнай» песні стаў асновай класічнага баладнага матыву «тры птушачкі ля забітага малойчыка» [54, с. 90]. У энцыклапедыі «Міфалогія беларусаў» (2011) Л. Салавей належыць артыкул, у якім акрэслены рытуальна-міфалагічная семантыка абраду і яго лакалізацыя паводле апошніх навуковых дадзеных [38, с. 353].

У кантэксце этнамузыкалогіі асобныя песенныя ўзоры, зафіксаваныя ў рэгіёне беларуска-ўкраінска-рускага памежжа, першым разгледзеў В. Ялатаў. У працы «Песні ўсходнеславянскай агульнасці» (1977) прыводзяцца тры варыянты з нотным дадаткам. У томе БНТ «Веснавыя песні» (1979) у раздзеле «Карагоды» – чатыры варыянты з нотнымі дадаткамі. В. Ялатаў характарызуе распевы варыянт карагода «Страла», зафіксаваны З. Радчанка (№ 294): метрычная пераменнасць 6/4, 5/4, несіметрычна расстаўленыя ферматы пры захаванні асноўнай метрычнай формулы, захаванасць тыповай страфічнай формы (ABRB) [8, с. 58].

Галоўныя канцэптуальныя здабыткі ў вывучэнні абраду ваджэння/пахавання «стралы» былі зроблены ў 1980–90-я гг. на матэрыяле экспедыцый этнамузыколагаў Маскоўскай кансерваторыі (1966–1983) пад кіраўніцтвам Н. Савельевай і Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР пад кіраўніцтвам М. Талстога. Сярод гэтых здабыткаў – паглыбленне этнамузыкалагічнага вывучэння абраду В. Пашынай (1986). На аснове картаграфавання тыпаў напеваў каляндарных песень паўднёва-ўсходніх раёнаў Беларусі даследчыца вылучае дзве спеўныя каляндарныя традыцыі, па-рознаму арыентаваныя ва ўсходнеславянскай спеўнай культуры, – прыпяцкую і дняпроўска-сожскую [46, с. 52]. Дынаміка ўзаемадзеяння гэтых традыцый дазваляе глыбей зразумець этнафонію «стрэльных» песень і карагодаў.

Значны ўклад у фонд фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў па «Страле» зроблены Г. Барташэвіч падчас экспедыцый Інстытута

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР на Гомельшчыну. У манаграфіі «Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя» (1985) ёю даецца глыбокае тэарэтычнае асэнсаванне гэтых матэрыялаў, многія з якіх упершыню ўводзяцца ў навуковы зварот. На іх аснове ўдакладнена лакалізацыя ўнікальнага фальклорна-этнаграфічнага комплексу ваджэння/пахавання «стралы», якая, паводле Г. Барташэвіч, супадае з вобласцю рассялення *радзімічаў*, часткова *дрыгавічоў і вяцічаў*. Даследчыца канстатуе сюжэтную ўстойлівасць песень «Стралы» як у межах беларускай этнічнай традыцыі, так і ў традыцыі рускай і ўкраінскай; пры гэтым яна адзначае варыятыўнасць хранатопу абраду. У пытанні генезісу абраду пахавання «стралы» Г. Барташэвіч прытрымліваецца тэорыі «асноўнага міфа» В. Іванова і В. Тапарова. Істотнымі міфасемантычнымі аспектамі абраду з'яўляюцца таксама шлюбна-матрыманіяльны і паляўніча-вытворчы [2, с. 130–133].

У 1986 г. В. Гусеў робіць сістэмнае асэнсаванне абраднасці ваджэння/пахавання «стралы». Даследчык сцвярджае яе суаднесенасць з вяснова-летнімі рытуаламі славян з акцыянальным матывам пахавання сімвалічных фігур (*Ярылы, Кастрамы, кукушкі* і інш.). Галоўным кампанентам міфасемантыкі ён лічыць аграрную магію, у якой узаемазвязаны магія прадуцыравальная і ахоўная [15, с. 73].

Галоўным унёскам В. Гусева ў распрацоўку «стрэльнай» праблематыкі ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы з'яўляюцца этнасеміятычны ракурс і чляненне структуры абраду на акцыянальную, прадметную (атрыбутыўную) і вербальную [15, с. 69–72]. У акцыянальнай структуры, паводле даследчыка, істотная роля належыць розным харэаграфічным формам, самая адметная з якіх – «танок». У атрыбутыўнай структуры дамінуюць дзве групы рытуальных прадметаў: звязаныя з жаночым касцюмам і раслінныя, абумоўленыя вегетатыўнай магіяй. Вербальную структуру абраду практычна ва ўсіх без выключэння варыянтах складае шматразовае выкананне песні «Страла». Прыводзіцца пяць сюжэтных варыянтаў гэтай песні [15, с. 70–71]. «Памежны характар усходнепалескага абраду зрабіў яго структуру "адкрытай", – піша В. Гусеў, – даў магчымасць асіміляцыі ў лакальных варыянтах некаторых элементаў папярэдніх абрадаў (пераапрананне і маскаванне, абход двароў) ці наступных за ім абрадаў (утапленне ў рацэ зялёнай галіны, кіданне ў ваду вянкоў)» [15, с. 73]. Аўтар даказвае, што структура абраду варыятыўная і адрозненні паміж лакальнымі варыянтамі часам значныя, а назіранні за сучасным станам абраду адлюстроўваюць розную ступень захаванасці традыцыі ў лакальных варыянтах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванні Г. Барташэвіч і В. Гусева шмат у чым прадвызначылі кірунак далейшага вывучэння гэтай унікальнай з'явы. Праца В. Гусева «Вождение “стрелы” (“сулы”) в Восточном Полесье» ў скарачэнні ўключана ў том БНТ «Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі» (1990). Як ужо адзначалася, з 1980-х гг. узрастае збіральніцкая актыўнасць у рэгіёне распаўсюджвання абраду.

А. Гурскі ў выданні БНТ «Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі» (2003) апісвае вынікі экспедыцый 1981–1983 гг., здзейсненых у Веткаўскі раён групай даследчыкаў Акадэміі навук. Яны здолелі зафіксаваць шасцігадзінны абрад, у якім брала ўдзел значная колькасць носьбітаў традыцыі і гасцей. Этапы абраду выконваліся строга паслядоўна, за чым сачылі старэйшыя жанчыны. Выканальніцы і госці, як піша А. Гурскі, не змешваліся, што сведчыць пра захаванне сакралізаванасці абрадавых дзеянняў у жывой традыцыі. Схематычнае апісанне ваджэння «сулы», або «стралы», і адзначэнне некаторых лакальных асаблівасцей міфасемантыкі абраду дае К. Кабашнікаў у кнізе «Памяць: Добрушскі раён» (2001). Аўтар прыводзіць запісы карагодных песень, зробленыя ў 1993 г. Г. Барташэвіч.

Р. Кавалёва ў даследаванні «Песні абраду ваджэння і пахавання “стралы” ў сусветным міфалагічным кантэксце» ставіць задачу «інтэрпрэтацыі паэтычных тэкстаў, усведамлення іх глыбіннай сувязі з абрадамі і адпаведным міфалагічным кантэкстам». Яна дае арыгінальную трактоўку *стралы* як міфалагемы, якая знаходзіцца на перакрыжаванні семантыкі двух сусветных міфаў: міфа пра свяшчэнны шлюб зямлі і неба і «асноўнага міфа» (змаганне Грамавіка з хтанічным Змеем). Гэта дуалістычная прырода міфалагемы *стралы*, паводле Р. Кавалёвай, стварыла даволі стракаты малюнак паэтычных матываў і вобразаў, надала амбівалентны характар абраду, што найбольш яскрава выяўляецца пры разглядзе парадаксальных сітуацый асноўнай песні ў параўнанні з абрадавымі дзеяннямі [25, с. 88]. Даследчыца звяртае ўвагу, што спеўна-вербальны кампанент абраду «страла забівае ахвяру» і акцыянальны кампанент «пахаванне прадметаў, якія ўвасабляюць стралу» з'яўляюцца семантычна эквівалентнымі, таму што грунтуюцца на апазіцыях *верх/ніз, неба/зямля, бог/змей*. Таксама ўказваецца, што семантыка *стралы* ў беларускім фальклоры мае не толькі міфалагічную прыроду: яна ўвасобіла і сямейна-шлюбную прагматыку, што выяўляецца праз міфалагемы *сватанне-паляванне* і *страла кахання*. Аналіз асобных гульнёвых і песенных узораў абраду дае падставы даследчыцы вылучыць яшчэ адзін міфалагічны матыў пахавання стралы –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«сям'я Грамавіка». На наш погляд, ён можа разглядацца як адмена міфалагічнага сюжэта змеяборства.

Актуальнасць рэгіянальнага вывучэння фальклору даказана В. Новак у працы «Абраднасць і паэзія пахавання стралы» (2002), дзе змешчаны вельмі значны фальклорна-этнаграфічны матэрыял, сабраны ў апошнія гады (апублікавана больш за 150 палявых запісаў з 80 вёсак Гомельшчыны). Даследчыца ўпершыню апісвае шэраг лакальных асаблівасцей абраднасці ваджэння/пахавання «стралы». Ідучы ў рэчышчы закладзенага В. Гусевым структурнага этнасеміятычнага вывучэння гэтай з'явы, В. Новак выяўляе яе лакальную спецыфіку на ўсіх узроўнях (час і месца правядзення, структура, склад удзельнікаў, семантыка рытуальных дзеянняў, атрыбутыка). Істотна ўзбагачаны ёю звесткі пра атрыбутыўны і вербальны код «стрэльнай» абраднасці.

Вялікая колькасць сабраных пад кіраўніцтвам В. Новак матэрыялаў дазволіла распрацоўваць новыя гіпотэзы генезісу і эвалюцыі абрадавага комплексу ваджэння/пахавання «стралы». Л. Вінаградава ў 2004 г. упершыню даследавала вербальныя кампаненты абраду ў кантэксце вывучэння механізмаў узаемадзеяння слова і рытуала, выявіўшы ўплыў фальклорнага тэксту на структуру, семантыку і тэрміналогію самога абраду.

Зона пашырэння асноўнай «стрэльнай» песні шырэй за зону бытавання абраду. Але толькі ва ўсходнепалескім рэгіёне, як піша Л. Вінаградава, гэта песня апынулася ўцягнутай у каляндарны вясновы абрад, пры тым, што на астатняй усходнеславянскай тэрыторыі яна працягвае бытаваць як пазаабрадавая. Гэта адбылося таму, што асноўнай мэтай праваднога вясньова-летняга абраду на тэрыторыі Усходняга Палесся была менавіта ахоўная магія ад навальніцы і наогул ад прыродных катаклізмаў, а лексема *страла* ў беларускіх гаворках шырока ўжываецца ў значэнні «маланка». На падставе гэтай лексіка-семантычнай сувязі слова, якое спачатку толькі маркіравала зачын песні, уключылася ў абрадавы комплекс і зрабілася яго ключавым тэрмінам для абазначэння розных абрадавых рэалій і паняццяў: *уласна абрад, спосаб абрадавага руху, абрадавы прадметны сімвал, песня з адпаведным зачынам, канкрэтны дзень ці свята* [7, с. 222–224].

Л. Вінаградава абагульняе палявы матэрыял і групіруе матывіроўкі (тлумачэнні) носьбітаў традыцыі адносна сэнсу і мэты абраду ваджэння/пахавання «стралы». Да такіх тлумачэнняў у першую чаргу належыць цэлая група матывіровак, якія выяўляюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метэаралагічную семантыку. Другая па аб'ёме група – тлумачэнні рытуалу як рэалізацыі магіі забеспячэння ўраджаю (злакавых, агародніны, ільну, канапель). Трэцяя група матывіровак заснавана на ідэі неабходнасці выгнання з вёскі нячыстай сілы і хваробных духаў. Яны праяўляюцца ў тых варыянтах абраду, дзе на чале працэсіі рухаюцца «старцы», «дзед і баба», выносячы за межы сяла пудзіла ці антрапаморфную лялька [7, с. 226–227]. Даследаванне Л. Вінаградавай пераканаўча даказвае, што ў пытаннях рэканструкцыі міфарытуальнай сімволікі абрадавых комплексаў песенны абрадавы фальклор патрабуе вельмі ўзважанага даследчыцкага асэнсавання. Гэта абумоўлена тым, што кодавыя сістэмы абраду і адпаведнай паэзіі могуць зусім не адпавядаць адна адной.

З 2010 г. прыкметна павялічваецца колькасць апублікаваных звестак па ваджэнні/пахаванні «стралы» ([27, с. 149–151; 32, с. 269–272; 14, с. 134–136]). 13 мая 2010 г. у в. Неглюбка Веткаўскага раёна ў правядзенні абраду пахавання стралы бралі ўдзел студэнты і выкладчыкі кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам В. Калацэя і Т. Пладуновай. Матэрыял з гэтай экспедыцыі, які з'яўляецца эмпірычнай базай для стварэння мастацкай рэканструкцыі дадзенага каляндарнага свята ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, быў выдадзены Л. Мятлеўскай [43, с. 137].

У кн. 1 т. 6 акадэмічнага выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2012) уключаны арыгінальныя палявыя запісы знакамітага збіральніка і краязнаўцы Г. Лапаціна, фальклыстаў І. Смірновай і А. Боганевай, зробленыя пераважна ў Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці. Каляндар гэтага рэгіёна, як піша Т. Валодзіна, вылучаецца найперш сваім веснавым «модусам мыслення», г. зн. асаблівай распрацаванасцю, сэнсавай шматпланавасцю, багаццем формаў і факусіраваннем у святах веснавога цыкла ледзь не ўсіх ідэй каляндарнай звычаёвасці. А абрад ваджэння і пахавання «стралы» якраз складае гэты ўнікальны веснавы модус, знаходзячыся паміж Тураўскім карагодам на Юр'я і «Провадамі русалкі» на траецкім тыдні [62, с. 7]. У кн. 2 т. 6 этнахарэограф М. Козенка ўпершыню аналізуе харэаграфію абраду ў кантэксце спецыфічнай карагоднай традыцыі Гомельшчыны.

Значны аб'ём палявога матэрыялу па тэме ваджэння/пахавання «стралы» і яго канцэптуальнае асэнсаванне ў працах Г. Барташэвіч, Т. Валодзінай, Л. Вінаградавай, В. Гусева, Р. Кавалёвай, В. Новак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Пашынай, Л. Салавей і іншых даследчыкаў дазваляюць сёння рабіць наступныя высновы:

- зонай бытавання абраду ваджэння/пахавання «стралы» з'яўляецца «сярэдняе Падняпроўе і басейны рэк Сож і Дзясна, г. зн. тэрыторыя паўднёва-ўсходняй Беларусі, заходняй Браншчыны і паўночна-ўсходняй Украіны» [15, с. 64], а своеасаблівым эпіцэнтрам служыць Веткаўскі раён Гомельскай вобласці;
- па сваіх асноўных параметрах азначаны абрад адносіцца да групы так званых «праваднных» каляндарных рытуалаў, надзеленых рысамі сімвалічных «пахаванняў»;
- часавая прымеркаванасць ваджэння/пахавання «стралы» – Ушэсце (у лакальных варыянтах – Юр'я), якое трактуецца носьбітамі як завяршэнне каляндарнага перыяду, што раздзяляе вясну і лета (у лакальных варыянтах суадносіцца з хрысціянскім матывам узнясення Хрыста на неба на саракавы дзень пасля Пасхі);
- вербальную структуру абраду практычна ва ўсіх без выключэння варыянтах складае шматразовае выкананне галоўнай абрадавай песні, у зачыне якой гаворыцца аб страле, што забіла молайца; зона пашырэння «стрэльнай» песні шырэй за зону бытавання абраду;
- матывуючай формулай галоўнай абрадавай песні служыць міфалагема стралы, якая генетычна ўзыходзіць да «асноўнага міфа»; міфасемантыка абраднасці грунтуецца на ахоўнай магіі ад навальніцы і наогул ад прыродных катаклізмаў, прадуцыравальнай вегетатыўнай магіі і архаічным імператыве сезоннага ачышчэння вёскі ад нячыстай сілы і хваробных духаў;
- акцыянальная структура абраду ўключае паслядоўныя дзеянні: збор удзельніц у традыцыйным месцы вёскі пад спеў «Стралы», ваджэнне карагодаў, шэсце ўдзельніц шэрагамі («танок») да поля пад спеў «Стралы», ваджэнне карагода ў полі, перакатванне жанчын па полі, закопванне ў зямлю розных прадметаў, вырыванне з зямлі калосся ці травы, вяртанне ў вёску і святочны абед; адметная роля ў акцыянальнай структуры належыць харэаграфічнай форме «танок»;
- у атрыбутыўнай структуры дамінуюць дзве групы рытуальных прадметаў: звязаныя з жаночым касцюмам і раслінныя, абумоўленыя вегетатыўнай магіяй;
- выканальніцы абраду – жанчыны і дзяўчаты (у лакальных варыянтах – таксама пераапранутыя мужчыны, хлопцы);
- значнае вар'іраванне назваў ва ўсім рэгіёне бытавання (*страла/стряла/сула; вадзіць стралу / вадзіць сулу / вадзіць вясну; за-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*копваць стралу / хаваць вясну / правады вясны; Ушэсце / Ушэсце праважаць / Узнясенне Гасподне / правады Ісуса Хрыста; сена/ ёлка; ганяць старцоў / хаваць старца* і інш.) сведчыць аб тым, што структура абраду варыятыўная: фіксуюцца значныя адрозненні паміж лакальнымі варыянтамі.

Сёння абрад прыцягвае значную ўвагу навукоўцаў і дзеячоў культуры (Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Жывая спадчына Беларусі»; відэафільмы: «Як пушчу стралу», дак. фільм, рэж. Юрый Выдронак, 2008; «Адраджэнне абраду “Ваджэнне і пахаванне стралы”», дак. фільм, рэж. Аляксандр Карпаў, 2011; аўдыёматэрыялы: Guda [Гуказапіс] : архаічныя абрадавыя сьпевы / [выконвае гурт] Guda. – 2-е выд. – [Мінск] : БМAgroup, 2007. – 1 гук. дыск (47 хвіл.); Дзяньніца [Гуказапіс] : выбранае, 1985–1995. – Мінск : Ковчег [2011]. – 1 гук. дыск (58 хвіл.) і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ